# Гэта нельга забыць

***Пётр Шаўцоў – карэнны хацімчанін. У 1941 годзе яму было ўсяго 10 гадкоў. Але ён добра памятае дзень 22 чэрвеня, калі раніцай закончылася мірнае жыццё і на два гады ў жыццё жыхароў раёна ўвайшла вайна. Прынесенае ёю гора, да гэтай пары, праз 69 гадоў, жыве ў яго сэрцы.***

- Мы пражывалі на вуліцы Камсамольскай, - успамінае Пётр Пятровіч. – Бацька працаваў у вяровачнай арцелі, а маці вяла хатнюю гаспадарку і даглядала дзяцей. Хата наша была вялікай, а таму бацька даў згоду, каб у ёй размясцілася пякарня: пяклі здобу розную. Жылі добра, усяго хапала.

У той год 22 чэрвеня было ў нядзелю. Бліжэй да поўдня па радыё абвясцілі, што Германія вераломна напала на нашу краіну. Добраахвотна, разам з іншымі хацімчанамі, бацька пайшоў на фронт. Ад яго прыйшло толькі адно пісьмо...

Вайна да Хоцімска дакацілася вельмі хутка. Пры адступленні чырвонаармейцам быў дадзены загад: знішчыць прамысловыя прадпрыемствы, адміністрацыйныя будынкі. Іх проста падпалілі... Калі сталі чутны раскаты боя, Шаўцовы падаліся бліжэй да цэнтра пасёлка, да сваіх знаёмых Кузняцовых, на вуліцу Зялёную (цяпер гэта вул. Пралетарская **Н.К.**). Раніцай Пеця пачуў крокі. Дзіцячая цікаўнасць узяла верх. Ён адкрыў фіранку, а за вакном стаіць немец. Потым той стаў грукатаць у дзверы. Дарослыя выйшлі. Немец стаў тлумачыць, каб не баяліся. А малому Пецю нават даў пачастункі. З таго дня людзі ў адзенні мышынага колеру з крыжамі на грудзях пачалі наводзіць "новы парадак".

Вярнуліся ў сваю хату, дзе ўжо "папрацавалі" марадзёры. Што ж зробіш, трэба неяк працягваць жыць. Знайшліся прыхвасні, якія далажылі, што ў Шаўцовых у хаце была пякарня. Немцы сталі выпякаць хлеб. А ноччу, для сваіх патрэб, хлеб пяклі ўласаўцы (была такая руская «вызваленчая» армія **Н.К.**)

- Што рабілі дзеці, гавораць, што ў Хоцімску іх было многа? – пытаюся ў яго.

- Дапамагалі сваім маці па гаспадарцы. Немцы далі дазвол на адкрыццё школы. Яна размясцілася ва ўцалеўшым будынку на вул. Ленінскай. З прадметаў толькі выкладалі матэматыку ды пісьмо. Іншыя забаранілі. Настаўнікамі былі тыя, хто не паспеў эвакуіравацца. Маці наша стала шыць адзенне, тым самым зарабляючы на жыццё.

Вялікіх разбоеў у Хоцімску пэўны час не было. Мірнае насельніцтва фашысты не чапалі. Пакуты толькі выпалі на яўрэяў. Летам 1942 года іх усіх сагналі ў лагер. Там, за калючым дротам, трымалі каля двух месяцаў.

- Я бачыў, як вераснёўскім ранкам калона, абараняласся ўзброеннымі немцамі і паліцаямі, рухалася па вуліцы ўбок льнозавода. Там у пачатку вайны ўзвялі проціватанкавы роў. Спачатку ішлі мужчыны, потым жанчыны з дзецьмі і старыя, - уздыхнуўшы цяжка гаворыць мой субяседнік. – Праз некаторы час пачалася стрэляніна. Усе гэтыя людзі загінулі. Толькі тады і дарослыя, і дзеці зразумелі, што акупанты – гэта зверы ў чалавечым абліччы...

***Раніцай вярнуліся ў Хоцімск. А там ужо доўгачаканыя вызваліцелі. Колькі было радасці! Людзі абдымалі чырвонаармейцаў, цалавалі іх і плакалі. Гралі гармонікі, дзяўчыны спявалі песні, нават танцавалі. Гэта нельга забыць!***

У канцы верасня 1943 года да гарадка стаў даносіцца гул баёў. Немцы паспешна сталі адыходзіць, знішчаючы ўсё, што яшчэ было. Хоцімск гарэў увесь. Людзі мітусіліся па вуліцах не ведаючы, як выратаваць свае хаты. Наша таксама гарэла. Мы з маці падаліся ў Іваноўскі гай. Увесь дзень прасядзелі там. Толькі ноччу пайшлі ў вёску Іваноўка і папрасіліся пераначаваць. Раніцай вярнуліся ў Хоцімск. А там ужо — доўгачаканыя вызваліцелі. Колькі было радасці! Людзі абдымалі чырвонаармейцаў, цалавалі іх і плакалі. Гралі гармонікі, дзяўчыны спявалі песні, нават танцавалі. Гэта нельга забыць! Пакрысе стала наладжвацца жыццё. Хацімчане пачалі ўзводзіць жыллё. Цяжка было, бо мужчын мала, ды і тыя старыя, або інваліды. Таму ўсе работы прыходзілася рабіць жанчынам ды нам, падлеткам. Не хапала адзення і абутку, нейкі час жылі ў зямлянках. Але ўсё вытрымалі. Агульнымі намаганнямі аднавілі разбураную народную гаспадарку. Зараз мы жывём пад мірным небам роднай Беларусі. З кожным годам яна прыгажэе. Не пазнаць і мой родны Хоцімск. Жыхары падтрымліваюць чысціню і парадак. Штогод 26 верасня гараджане прыходзяць у сквер да Брацкай магілы, каб аддаць даніну памяці загінуўшым пры вызваленні воінам. І так будзе заўсёды.

**Наталля КАЦЯШОВА.**

**Кацяшова, Н. Гэта нельга забыць** : [успаміны Пятра Шаўцова пра першы дзень вайны і вызваленне Хоцімскага раёна] / Наталля Кацяшова // Шлях Кастрычніка.— 2010.— 25 верасня.— С. 3.